075
140193
42300 — 140193

# НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ

ПАЛІТЫЧНА - ГРАМАДЗКАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ЧАСОПІСЬ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ:
Вільня, Вострабрамская, 9.
Рэдактар і выдавец: А. КАРАБАЧ.

Выходзіць ТРЫ разы у тыдзень:
у панядзелкі, серады і пятніцы.

ЦЭНЫ АБВЕСТАК:
1 радок п-рад тэкстам . . . . 4 рублі
1 радок пасьля тэксту . . . . 2 рублі

№ 4. Вільня, Пятніца, 17 кастрычніка 1919 г. Цана 50 кап.

## Найважнейшая справа.

Калі прыслухацца цяпер аб чым гутараць беларусы, калі пачытаць аб чым пішуць, дык мы ўбачым адно, гэта—школы, школы і школы. Школа стала найважнейшаю справаю ў цяперашнім жыцьці беларускага народу, і гэта зусім зразумела. Беларускае адраджэньне, гэта адраджэньне перш-на-перш нацыянальнае і потым ужо дзяржаўнае. Без нацыянальнага адраджэньня немагчыма ніякае адраджэньне дзяржаўнае.

Тымчасам што-ж мы бачым. Палітыка генэральнага польскага школьнага інспэктара п. Вэнслаўскага, а таксама Горадзенскага інспэктара п. Возьніцкага, а за імі і ўсіх паветавых польскіх школьных інспэктароў, дый усяе польскае ўлады, каторая мае тыя ці іншыя адносіны да школы, бязупынна йдзе да таго, каб не дапусьціць беларускае школы. Народ просіць беларускае школы, зьбірае безканечныя подпісы, а дзе з ласкі свае пазволіць начальнік рэвіру, дык робяцца прыгавары сходамі аб адкрыцьці беларускае школы. А тымчасам польская школьная ўлада беларускае школы не дапушчае. Як-бы п. Вэнслаўскі сказаў: „Робце вы сабе, што хочаце, падымецеся за беларускую школу ўсе як адзін чалавек. Я ўсё-ж ткі вам яе ня дам“. Але народ, апрача свае беларускае школы, іншае ня хоча. І вось пачынаецца нездаволеньне, каторае завостраваецца, пашыраецца, абыймае ўжо цяпер ўсю інтэлегенцыю і бязмальна усю народную масу. У барацьбе за сваю школу ўскалыхнулася ўсё народнае беларускае мора. „Мы думалі, кажуць, што прыдуць прыяцелі, ажно нам не пазваляюць мець беларускае школы“. Ужо два месяцы, як гэтае беларускае народнае мора хвалюецца і каму карысьць з гэтага будзе мы ня ведаем, хіба, што ня Польшчы і ня братняму польскаму народу.

125 гадоў Маскоўшчына праваслаўных беларусаў старалася зрабіць ворагамі Польшчы, 125 г. ува ўсіх малых і вялікіх маскоўскіх школах у Беларусі ўзгадовавалі непрыяцеляў Польшчы і за 125 г. маскоўскага панаваньня ў нас Маскоўшчына не патрапіла зрабіць гэтулькі непрыяцеляў і зла для Польшчы ў нас, колькі зрабіў, ужо ня толькі паміж беларусоў праваслаўных, але і каталікоў, за два месяцы свайго панаваньня п. Вэнслаўскі з сваймі памагатырамі.

Калі мэта польскае эндэцыі ў нас ё пасварыць два суседнія братнія народы — беларускі і польскі, дык у гэтым яна ўжо шмат дапяла.

Без аздараўленьня школьнай справы ў нас, не магчыма ніякая супольная праца беларусоў з палякамі і мы на школьную справу ў Беларусі зварочуем увагу тых палякоў, каторыя ў гэтай супольнай працы бачаць рэальную карысьць для абодвух народаў.

Я. С—ч.

# АПОШНІЯ НАВІНЫ

## Паведамленьні Польскага Генэральнага Штабу.

### Фронт Літоўска-Беларускі.

**Варшава**, 14. На паўдні ад Бабруйска бальшавіцкія аддзелы, перайшоўшыя раку Птыч з мэтаю атакаваць нашыя пазіцыя пад Бубнаўкай і Лушыцамі, контратакай былі адкінуты на ўсходні бераг Птыча.

Спробы бальшавікоў перайсьці цераз Дзьвіну ля Краслаўкі і ля Дзьвінска былі адбіты.

**Варшава**, 15. Атакі непрыяцеля на поўдзень ад Полацка ў кірунку Лепеля і Каменя адбіты з вялікімі для яго стратамі.

• • • • • • • • • • •

### Забастоўкі.

**Варшава**, 15. X. Учора забаставалі працаўнікі на тэлефонах „Cedegren“.

**Варшава**, 15. X. Урад адхінуў максімальнае дамаганьне земляробскіх работнікаў. Дзеля гэтага сэкрэтарыят саюзу земляробскіх працаўнікоў абвесьціў забастоўку на чацьвер, 16 кастрычніка.

### Маскоўска-нямецкі саюз.

Швэдзкая тэлеграфная агэнтура ў Рызе мае весткі з Бэрліна аб тым, што ўжо істнуе нямецка-маскоўскі саюз, маючы мэтаю зрабіць ізноў у Расеі манархію. У ліку кіраўнікоў саюзу называюць: Біскупскага, Туган-Бараноўскага і Дзеругіна. Галоўная падпора саюзу — гэта корпус палкоўніка Бэрмонта, які знаходзіцца ў Латвіі. Ня гледзячы на тое, што штаб расейскіх войск стаіць у Нарве, палкоўнік Бэрмонт адмовіўся перавясьці свае войска на нараўскі фронт, кажучы, што ён павінен дапяць перш-на-перш канкрэтнага рэзультату у Латвіі і Эстоніі. Швэдзкія газэты ўжо дасталі афіцыяльныя весткі латышскага міністэрства, якія паведамляюць аб непаразуменьнях паміж корпусам палк. Бэрмонта і войскамі латышскімі. Гэтыя-ж самыя газэты цьвердзяць, што фон-дэр-Гольц памагае Бэрмонту.

### Фон-дэр-Гольц хоча ісьці на Маскву.

**Парыж**, 13. X. (В. Б. К.). Агэнцыя Гаваса паведамляе, што літоўскі ўрад дастаў копію ліста капітана Вэбэра, афіцэра арміі генэрала фон-дэр Гольца, у каторым ён піша, што нямецкае войска ў балтыцкіх правінцыях і расейскае войска ў лічбе каля 100,000 чалавек гатуюцца разьбіць Літву і Эстонію і пайсьці маршам на Маскву. Балтыцкія гаспадарствы будуць аддадзены пратэкторату Расеі, але нямецкі жыхары у гэтых краёх дастануць поўную аўтаномію.

### Антанта і Балтыцкія Гаспадарствы.

ВЕНА. 13. X (В. Б. К.) Бэрлінскі карэспондэнт „Der Neue Tog“ паведамляе, што ў палітыцы Антанты да Балтыцкіх гаспадарстваў стаўся новы паварот. Рада Пяцёх разглядае магчымасьць агульнай барадзьбы проці бальшавікоў і прабуе пацягнуць немцаў да гэтага пляну.